увагу тое, што аўтарам супрацьпастаўляюцца **статычныя** ў большасці сваёй малюнкі сцэн, у якіх удзельнічае вясковая грамада, з **дынамічнай** выявай гарадскога натоўпу.

Грамада ў апавяданнях Якуба Коласа – шматпланавы і поліфанічны вобраз, які прымае актыўны ўдзел у выбудоўванні складанага, эпічна разгорнутага мастацкага свету пісьменніка.


Літаратура:

1. Колас Якуб. Збор твораў: У 14 т. – Т. 4. – Мн., 1973.


**І.М. Гоўзіч** (г.Мінск)

## МАСТАЦКАЯ ДЭТАЛЬ І СІМВАЛЫ Ў ПАЭЗІІ ЯКУБА КОЛАСА І ЯНКІ СІПАКОВА

У апошні час літаратуразнаўства усё больш і больш аперыруе паняццем "мастацкая дэталь". Дэталь – гэта сапраўды найвялікшае вынаходніцтва мастацкай мадэлі свету. Апісальна можна бясконца характарызаваць які-небудзь прадмет або з'яву, мастацкая ж дэталь адной характэрнай рысай адкрывае самае істотнае ў вобразе, перадае яго сутнасць: "Дэталь і ёсць перш за ўсё характэрная, эстэтычна асэнсаваная, выбраная прыватнасць, якая "узбуджае" уяўленне аб прадмеце, вызначае як бы нейкую хітрынку, сакрэт вобраза, тое, што не заўсёды выкажаш лагічным пераказам" (1, 117).

Янка Сіпакоў у сваім вершы "Тураўская элегія" пры апісанні былога магутнага горада ўжывае такі выраз, што з'яўляецца трапнай мастацкай дэталлю, якая паказвае няспынны і жорсткі ход часу, гісторыі: **прысеў горад**. Нават самае вялікае і моцнае паступова мізарнее, і наша справа – не забыць пра гэта, помніць сваю гісторыю:

Як **прысеў** ты, драўляны **горад!**
З крэктам з замкавай споўз з гары (2, 83).

Дэталь і ёсць перш за ўсё нейкая свежая, прыкмечаная вокам толькі сапраўднага мастака "жывінка", якая вылучаецца з усяго мноства характарыстык прадмета ці з'явы.

Не абавязкова гэта павінна быць самае асноўнае, але яна, гэтая дэталь, нейкім чынам праз раптоўна схопленую пабочную рысу абуджае ланцуг асацыяцый, мінаючы ўсю паслядоўную лагічную сувязь прамежкавых ступеняў, нараджае вобраз, асвятляе, дамалёўвае ўсю карціну.

Так, у наступным вершы Янка Сіпакоў вельмі ўдала выкарыстоўвае мастацкую дэталь, якая ў двух словах раскрывае сутнасць чалавека, што не можа раўнадушна прайсці каля любога прадмета, ніколі не застаецца абыякавым, яго ўсё турбуе. Гэта – **вуглаваты чалавек,** які чапляецца за ўсё на зямлі: за лясы, за хаты, за святы, за моды, за густы, за сынавы ручаняты, за пах капусты, за неба, за зоры, за гнёзды.

У паэта-шасцідзесятніка, які так па-майстэрску можа пісаць, выяўляючы шматгранны сэнс у маленькай кроплі – мастацкай дэталі, быў вялікі папярэднік, настаўнік Якуб Колас. Помнім да гэтага часу яго трапнае з "Нёманава дара" – людскі натоўп, абураны паводзінамі каморніка, насоўваўся на яго "хмарай". Адно слова ў творным склоне, але якое! У ім, гэтым слове – параўнанні, заключана шматгранная ацэнка сітуцыі: народ абураны, настроены рашуча супроць уладаў, ён – адзіны маналіт, адно цэлае, яго не спыніць у паходзе за справядлівасцю і праўдай. І зусім іншы – таксама шматгранны, але іншага, светлага колеру – настрой, выказаны адным штрыхом-дэталлю: лес каля лесніковай пасады стаяў "**гожаю падковай**". Таксама адно-адзінае параўнанне, а які глыбокі сэнс, якая магутная любоў да існасці, прыроды ім выказана!

Было ў каго вучыцца Янку Сіпакову – наследніку такой "аздобленай" трапнай дэталлю Коласавай паэзіі, прадаўжальніку яе традыцый.

Прынцыпы, па якіх робіцца падбор пісьменнікам часцінак-дэталяў, даволі простыя: паэт выбірае характэрнае з бясконцых з'яў рэчаіснасці па тых жа законах, па якіх мы ўсё ў жыцці ўспрымаем, запамінаем, урэшце, арыентуемся ў абставінах. Гэтак жа па асобных, ледзь прыкметных, але характэрных рухах, рысах мы і пазнаём характары людзей, сутнасць з'яў, прадметаў. Самы галоўны закон стварэння мастацкіх дэталяў – гэта вылучэнне вядучай канкрэтнай прыкметы ў назіраемай з'яве (ці прыкметаў, але, як правіла, нямногіх) і ўзнаўленне цэлага па малому, характэрнаму.

У апошні час у крытычнай літаратуры часта стаў ужывацца тэрмін "асацыятыўная вобразнасць" замест "мастацкая дэталь", і справядліва, бо пад гэтым тэрмінам звычайна разумеюць тропы, у якіх нечакана суадносяцца з'явы, вельмі розныя, вельмі аддаленыя па сваёй сутнасці і змесце, што выяўляюць складаныя жыццёвыя сувязі, паглыбляюць наша ўспрыманне жыцця, уяўленне аб ім. У творы могуць быць менш яркія, менш удалыя дэталі. Адны вылучаны, іншыя наадварот, у мастацкіх мэтах выказаны прыглушана, мімаходзь.Некаторыя з іх мастацкі такт падказаў аўтару ўсяго толькі назваць. Пра тое, што Янка Сіпакоў з'яўляецца сапраўдным майстрам мастацкай дэталі, сведчыць наступны верш-балада, у якім аўтар ужывае не адну, а некалькі дэталяў. У адпаведнасці з усім вышэйсказаным **губы** ката Я. Сіпакоў называе толькі **губамі.** А ў

дзяўчыны яны атрымліваюць найменне **вусны**. Гэта першая дэталь. Пасля перанесеных здзекаў ката дзяўчына пойдзе на эшафот мёртвай, але не маральна зломненай. Яна ў тысячу разоў жывейшая і за катаў, і за плебеяў, што сабраліся паглядзець на смерць чарговай ахвяры. Дзяўчына памрэ для кахання і для гэтага жорсткага свету і грамадства, якія выдумалі такія здзекі:

Забыць паможа той апошні ранак,
Як пахнуць **губы** катавы пагана –
Халодныя,
Нібыта жаба тая,
Што скача каля **вуснаў.**
Не збягае
Яна з тых **вуснаў** светлых, беззаганных,
Якіх і не рашыўся так каханы
Хоць дакрануцца... (2, 90–92).

Такім чынам, вельмі многія мастацкія дэталі ў творах і Якуба Коласа, і Янкі Сіпакова ствараюцца звычайным, простым словам, яго багатай змястоўнасцю, канкрэтызуюцца, апрадмечваюцца, зараджаюцца экспрэсіўнай, стылявой энергіяй слова. Так, напрыклад, з'явіўся вобраз-дэталь – пачатак "Новай зямлі" Якуба Коласа:

Мой родны кут, як ты мне мілы!

Метафарычнасць лірыка-паэтычнага слова вельмі часта перарастае ў сімвалічнасць. "Сімвал (ад грэч. symbolon – умоўны знак) – адзін з відаў паэтычнага іншасказання, умоўнае абазначэнне якой-небудзь з'явы, паняцця пэўным прадметным ці вобразным знакам. Сімволіка ўзнікла ў глыбокай старажытнасці, і ў якасці сімвалаў выступалі пэўныя прадметы, расліны, жывёлы, з'явы прыроды, колеры" (4, 107).

Вобразная сімволіка шырока выкарыстоўваецца ва ўсіх відах і жанрах мастацтва, таму што ўсякі мастацкі вобраз заключае ў сабе знакавасць, паказваючы ў адзінкавым агульнае, раскрываючы праз знешняе ўнутранае, духоўнае.

Так, у вершы Янкі Сіпакова "Белыя вароны" адразу кідаецца ў вочы вобраз-сімвал **белыя вароны,** якi тлумачыцца ў эпіграфе, – так кажуць пры тых, хто "не ўмее жыць". Гэты сімвал з'яўляецца даволі новым:

Трывожна ў небе крыляе
Чародка **белых варон.**
У іх вачыма страляюць,
Рагочуць ім наўздагон. (2, 161).

У Якуба Коласа ў паэме "Сымон-музыка" "варона-хвальбона" выступае, наадварот, сімвалам дурaслівай няўдаліцы, што хоча стаць вышэй за сябе, крылатай птушкай.

У паэзію сімвалы прыйшлі з фальклору. Асабліва заўважаецца гэты ўплыў у творчасці тых паэтаў, якія арыентаваліся на фальклорныя традыцыі. Сярод іх і Якуб Колас, і яго спадкаемец Янка Сіпакоў. У першага без ведання фальклору не было б ні "Новай зямлі", ні "Сымона-музыкі", у другога – ні ягоных балад з двойчы перавыдадзенай кнігі, ні вершаў і апавяданняў прытчападобнага характару.

У шматлікіх вершах Янкі Сіпакова сустракаюцца такія сімвалы, як **Сонца** – крыніца жыцця і святла, **Гнязда** – малой радзімы, хаты:

Вы кажаце, гэта дзед? Гэта ж бацька,
Што столькі сыноў павыкрыльваў у людзі,
А сам са старою застаўся ў прасторным, астылым **гняздзе** (2,173).

Сонца саграе зямлю, надае ёй сілы, спатольвае прагу жыцця ў "Казках жыцця" Якуба Коласа, а яго паэма "Новая зямля" ужо загалоўкам сваім засведчыла любоў мастака да роднага гняздоўя, па сутнасці, сталася творам-сімвалам неўміручасці малой радзімы, кутка, дзе нарадзіліся і знойдуць апошні прытулак героі – старыя і маладыя – твора.

Акрамя "прадметнага" вобраза-сімвала, Янка Сіпакоў ужывае ў вершах і сімвалічны колер – **зялёны.** Зялёны колер – гэта колер, які сімвалізуе жыццё, радасць, маладосць, абуджэнне, вясну, лета, траву, лес. Ён адносіцца да разраду светлых, характарызуе светлыя з'явы:

Зямля – **зялёнае** сонца
З травою – **зялёнымі** промнямі (2, 41).

Дзякуючы такому нечаканаму спалучэнню, ствараецца яркі малюнак зялёнага жыцця. Наша планета – зялёнае сонца, а трава – гэта яго зялёныя промні. У Якуба Коласа сонца мае натуральны колер. Тут маладзейшы паэт як бы пераадольвае чыста рэалістычнае пісьмо.

У паэтычнай творчасці Янкі Сіпакова ёсць вобраз-сімвал, які ўзрушвае душу чытачу, – гэта **неадасланы ліст да маці** з аднайменнага твора паэта – сімвал абпаленага вайной і страчанага дзяцінства.

Даволі часта ў паэзіі Янкі Сіпакова сустракаецца вобраз часу, які перадаецца праз сімвал **гадзіннік. Гадзіннік** – увасабленне няспыннасці, незваротнасці часу, жыцця, патоку гадоў, суму па маладосці.

Галоўнае ў вобразе-сімвале тое, што ён заўсёды імкнецца за межы свайго канкрэтнага значэння, напаўняецца невычэрпнай энергіяй, што нараджае адну за адной паралелі і асацыяцыі. Сімвал узнікае тады, калі мастак вельмі вялікі аб'ём пачуцця, якую-небудзь шырокую ідэю, які-небудзь "сусветны" факт хоча перадаць нам наглядна, вобразна, не пры дапамозе абстрактнай думкі, а ў канкрэтным, што непасрэдна ўдзейнічае на ўяўленне, вобразе.

У сувязі з гэтым можна зрабіць выснову, што найважнейшая функцыя вобраза-сімвала – замацаванне і паэтызацыя ідэалаў. У

манаграфіі А.Ф. Лосева адзначаецца, што "сімвалы прагрэсіўных мастакоў, насычаныя агромністай грамадска-палітычнай і нават увогуле грамадска-гістарычнай сілай, з'яўляюцца або прароцтвам, або падвядзеннем вынікаў найвялікшых чалавечых катастроф і ўяўляюць сабой танюткія і вастрэйшыя інструменты для арыентацыі ў гэтых катастрофах, а таксама і метады іх пераадолення" (5, 202).

Вельмі часта ўжывае паэт і вобраз **зерня** як сімвал абнаўлення, нараджэння новага, еднасці чалавека з прыродай і няспыннага руху часу, пачатку:

О, **зернетка** –
Гэта ўжо работа.
Хай сабе яно і маленькае,
Але **зерне** праганяе адзіноту:
З ім на востраве,
Ужо як з сябрам, – удваіх... (3, 164).

Я згодзен **зерню** вечна пакланяцца –
Малое **зерне** месціць цэлы свет (2, 101).

Вобраз зерня – сімвал вечнага абнаўлення, неўміручасці жыцця – цэнтральны ў Якуба Коласа, і Янкі Купалы, і ў беларускай паэзіі ў цэлым. Не выпадкова, высока цэнячы такое значэнне слова-вобраза, Канстанцін Міцкевіч узяў псеўданім – Колас.

Нават назвы вершаў і цэлых зборнікаў становяцца ў Я. Сіпакова сімваламі. Так, напрыклад, назва кнігі "Веча славянскіх балад" – сімвал аб'яднання славянскіх народаў для пошуку адказаў на спрадвечныя пытанні, агульначалавечага роздуму над складанымі гістарычнымі праблемамі.

Пасля ўсяго вышэйсказанага можа з'явіцца пытанне: дык чым жа адрозніваецца сімвал ад мастацкай дэталі? Сімвал – гэта ўмоўнае абазначэнне якой-небудзь з'явы, а праз мастацкую дэталь аўтар раскрывае характар гэтай з'явы. Таму іх роля ў паэтычным кантэксце твора надзвычай вялікая, і ўдала і да месца выкарыстаныя, яны сведчаць пра значнасць таленту мастака.

Літаратура:

1. Гаўрош Н.В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. – Мн.: Народная асвета, 1992.
2. Сіпакоў Я. Выбраныя творы ў 2-х тт. Т. 1. Паэзія. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1995.
3. Сіпакоў Я. У поўдзень, да вады. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1976.

4. Рагойша В.П. Паэтычны слоўнік. 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мн.: Вышэйшая школа, 1979.
5. Лосев А.Ф. Проблема символа и реалистическое искусство. М.: Искусство, 1976.

**Ю.З. Дарняк** (г. Мінск)

## “ГЭТА КРЫК, ШТО ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ...”

Кожны чалавек імкнецца пакінуць след у жыцці. Дзеля гэтага перадаецца эстафета добрых спраў з пакалення ў пакаленне. Спосабы яе перадачы мяняліся, але сутнасць заставалася. Цяпер можна і не быць знаёмым са сваім папярэднікам, аднак працягваць яго справы. Асабліва выразна падобная пераемнасць праяўляецца ў мастацтве. Да прыкладу, можна прасачыць узаемаўплыў мастакоў як аднаго, так і розных пакаленняў, нават прадстаўнікоў розных народаў. Падобныя сувязі называюцца тыпалагічнымі.

У Пімена Панчанкі быў чалавек, з якога ён браў прыклад і якога імкнуўся таленавіта пераймаць. Вялікаму песняру ён прысвяціў шмат твораў, яго ідэі развіваў:

Толькі Вязынку,хату Купалы
Наш народ захавае навек,
Бо і сёння адгэтуль нямала
Пачынаецца песенных рэк.
(“Вязынка”)

Так здарылася, што ўвесь час пытанне нацыянальнай самабытнасці востра стаяла для Беларусі. Калі суседнія краіны задумваліся над шляхамі свайго далейшага развіцця, Беларусі неабходна было змагацца за выжыванне, за самазахаванне, дзяржаўнасць. Страціўшы дзяржаўную незалежнасць, апынуўшыся пад уладай спачатку Польшчы, а затым Расіі, большасць беларусаў зняверылася ў сабе, набыла рысы людзей “памяркоўных”. Гэтая акалічнасць турбавала знакамітых беларускіх пісьменнікаў, якія, імкнучыся памяняць стан рэчаў, абралі творы слоўнага мастацтва крыніцай прапаганды сваіх нацыянальна-вызваленчых ідэй.

Перадаць вартасць і годнасць беларускага народа імкнуліся яшчэ беларуска-польскія пісьменнікі ў 19 ст., аднак да рэалізацыі канцэпцыі нацыянальнай незалежнасці яны, думаецца, не ўзняліся.

Пачатак 20 ст. быў часам, калі беларусам быў дадзены шанц заявіць,што і яны нацыя,народ,які мае сваю гісторыю, мову, дзяржаву.